ГАЗЭТА РАБОЧА-СЯЛЯНСКАЙ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА І МЕНСКАГА КОМІТЭТАЎ ЛЕНІНСКАГА КОМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ БЕЛАРУСІ

№ 125 (507) Чацьвер, 10 лістапада 1927 г. | Выходзіць тры разы на тыдню у аўторак, чацьвер і суботу | Год. выд. VII. | Рэдактар прымае ад 12 да 2 гадз. дню. Сакратар ад 10—12 і ад 2—3 гадз. Тэл. № 903. | Адрас рэдакцыі газэты „Чырвоная Зьмена“: Менск, Комсам. 25.

НЕ ЗДАДЗІМ, ВЫТРЫМАЕМ, ПЕРАМОЖАМ!

ДНІ КАСТРЫЧНІКАВЫХ СЬВЯТ У ЧЫРВОНАЙ СТАЛІЦЫ БЕЛАРУСІ.

Дзесяткі тысяч працоўных прымалі ўдзел у дэмонстрацыі.

Наперадзе—неразвораныя цаліны.

Дні Кастрычнікавых урачыстасьцяў мінулі.

Прайшоўшыя дружна і згуртавана, з вялікім уздымам і бальшавіцкім энтузіязмам гэтыя дні яшчэ раз напомнілі аб неабходнасьці і на далейшы час умацоўваць, загартоўваць Савецкі Саюз.

Характэрнай, адрозьніваючай асаблівасьцю сьвяткаваньня дзесятай гадавіны было тое, што побач з агульнымі лёзунгамі нашы прадпрыемствы, плошчы і вёскі ўпрыгожыліся лёзунгамі, якія суровай і бесстаронняй мовай лічбаў і фактаў казалі аб конкрэтных дасягненьнях той ці іншай фабрыкі ці вёскі.

Пад знакам гэтых конкрэтных дасягненьняў у соцыялістычным будаўніцтве, пад знакам абароны Савецкага Саюзу прайшлі дні Кастрычнікавых урачыстасьцяў.

Кастрычнікавыя сьвяткаваньні—мінулі. Наперадзе — неразвораныя цаліны клапатлівай працы.

Наперадзе тое, аб чым гарачымі словамі адозвы напамінае Цэнтральны Камітэт Ленінскага Комуністычнага Союзу Моладзі — „Працоўная моладзь!

На парозе другога 10-годзьдзя Кастрычніка мы заклікаем цябе да бязьлітаснай барацьбы супроць жабрацтва і някультурнасьці ў вясковым жыцьці, тэхнічнай адсталасьці, беспрацоўя і бяспрытульнасьці, нэпмана, кулака, бюрократызму, безгаспадарнасьці і растачыцельнасьці, хуліганства і антысэмітызму, супроць усёй заклятай спадчыны старога, усёй гнілі, што ёсьць яшчэ ў нашай краіне, у жыцьці нашым у нашым быце. Мы заклікаем цябе да ўпартай працы, да энэргічнага будаўніцтва новай гаспадаркі на соцыялістычных пачатках, да гэроізму і самаафяраваньня на фронце працы, на фронце культуры.

Гэтыя задачы найвялікшага гістарычнага значэньня кладуцца перш за ўсё на плечы нашага пакаленьня“.

Павышаючы вытворчасьць працы, будуючы коопэрацыю ў вёсцы ахоўваючы межы Савецкага Саюзу—мы змагаемся за сусьветны Кастрычнік.

Мы жывём у незапамятны час, калі перад нашымі вачыма нашымі-ж рукамі ствараецца соцыялістычнае будаўніцтва.

Шчыльней шэрагі! Цьвярдзей дысцыпліну. Больш адказнасьці за кожнае выконваемае заданьне! Вышэй сьцяг Леніна!

Як бы ні вялікі былі цяжкасьці, нашым лёзунгам было і будзе:

— Не здадзім, вытрымаем, пераможам!

... Цаглінкаю румянай будуем новыя, нязнаныя нам дні!

Сьвята Кастрычніка было сьвятам соцыялістычных спраў.—Адчыніўся шэраг новых прадпрыемстваў. Будзем пашыраць нашыя дасягненьні.

Зазьзяе Асінастрой беларускай навукі

Нядаўна тут быў студэнцкі суботнік. Колектыўная праца сотак энэргічных і хуткіх рук была аддана падрыхтоўцы сталага месца для будучага **унівэрсытэцкага гарадка**.

І вось сёньня на гэтым пляцу зноў сабраліся студэнцкія колёны. Яны расьцягнуліся па полі няроўнай стужкай, самкнуўшыся кальцом вакол невялічкай канаўкі, ля якой спакойна ружавела грудка цаглінак і стаяла лаханка з разьведзеным цэмэнтам. Першыя цаглінкі, першыя жмені цэмэнту...

— Зусім нядаўна, нясецца з трыбуны голас **Баліцкага**,—зусім нядаўна, некалькі месяцаў назад мы закладвалі Асінастрой—першы беларускі індустрыяльны колёс, які электрыфікруе поўнасьцю 2 акругі нашай краіны. Сёньня мы закладваем **унівэрсытэцкі гарадок**, той гарадок, які стане **Асінастроем беларускай навукі**, ад якога, па бязьлічных правадох, панясецца сьвет ведаў ва ўсе куткі Беларусі.

Праз 5 год на гэтай бруднай плошчы вырасьце 12 гмахаў, 12 велізарных будынкаў, у якіх будзе кіпець, шукаць і выхоўвацца жывая навуковая думка...

Дык няхай-жа жыве наша справа— **справа соцыялістычнай культуры!**

Адзін за другім узыходзяць на трыбуну прамоўцы. Яны запальваюць восеньнае паветра гарачым полымем сваіх заклікаючых слоў — слоў цьвёрдай упэўненасьці і невычарпальнай сілы. **Кнорын, Галадзед, Пічэта, Вальфсон...**

Аб чым яны кажуць? Так, аб гэтым-жа, аб нашай вялікай справе, аб цаглінках і цэмэнце..

Але вось прамоўцы ад слоў перайшлі да справы. Яны спусьціліся ў канаўку і старанна кладуць цаглінкі ў фундамант. Чалавечая істужка нацягнулася і лопнула, усе кінуліся да канаўкі, абступілі яе вясёлай, цьвёрдай сьцяною...

З-за бялесай плёнкі хмар ледзь-ледзь усьміхнулася цьмянае сонца.

Урачыстасьць закладкі скончана. З пляцу распаўзаецца натоўп студэнцтва, профэсуры і шэфаў-чырвонаармейцаў.

Пераскакваю праз лужы з мэтай выбрацца на сухое месца, а ў памяці зьвіняць і зьвіняць недзе прачытаныя простыя радкі:

„... Як добра жыць! Цаглінкаю румянай
Будуем новыя, нязнаныя нам дні...“

Г.

Забясьпечаны добраякасным малаком.

Менск спажывае штодзённа каля 20 тысяч літраў малака. Неабходна задаволіць гэту патрэбу, дастаўляць насельніцтву кожны дзень па таннай цане і ў дастатковай колькасьці добраякаснае малако, рознага роду малочныя продукты.

У дзень Кастрычнікавага сьвята на рагу Маскоўскай і Грыгораўскай вуліц адбылася закладка трохпавярховага будынку для **цэнтральнай малочні**, якая павінна ўрэгуляваць збыт малака гарадзкому насельніцтву і снабжаць яго малочнымі продуктамі добрай якасьці.

Малочная будзе адпускаць акрамя малака таксама сьмятану, прастаквашу, сыр, масла і кефір.

„А я чаравічкі ў сьвята атрымаў...“

Не забыліся ў дні Кастрычнікавых сьвят пра дзяцей гарадзкой беднаты. Апошнія атрымалі шмат падарункаў.

Менскі гарадзкі камітэт узаемадапамогі выдаў дармова дзецям беднаты **35 пар абутку**; бяднейшым вучням школ раздаены сшыткі, алоўкі і інш. вучэбныя прылады.

Калёны Кастрычніка.

* Напярэдадні вялікага сьвята.

* «Алло! Алло!—Гаворыць Менск! Сёньня сьвяткуем 10-тую гадавіну Кастрычніка! Алло! Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!» Гэта гучнагаварыцель на Савецкай вуліцы загаварыў прызыўнымі Кастрычнікавымі лёзунгамі.

* **«Беларусь»**. Вытворчасьць Белдзяржкіно. Замільгацелі літары і кадры на маленькім экране ля памяшканьня Акрвыканкому. Фільм **«Беларусь»** закідаў выпадковых гледачоў лічбамі і яскравымі малюнкамі—фактамі аб будаўніцтве БССР.

Трыбуна на Пляцу Волі.

* Комвузаўцы з факеламі накіраваліся на Пляц Волі. Там адзін выступіў з прамовай:

— Таварышы! Пуанкарэ і Чэмбэрлен—нашы ворагі. Мы маем магчымасьць іх спаліць. Прапаную ўсім прыняць удзел у гэтым.

І комвузаўцы са сьмехам і жартамі падпалілі два лісты паперы.

* Прагучэў артылерыйскі салют. Поўнач.

— Значыць роўна 10 год назад:—падумаў кожны.

Мяккімі крокамі ішло вялікае 7-е лістапада...

* * *

* На рагу Савецкай і Ленінскай прайсьці нельга. Міма вялічэзнага натоўпу праходзіць дэмонстрацыя.

* Пляц волі. Бяз 5 хвілін 12. Пуста. Аніводнага чалавека.

* І раптам па Ленінскай 6 аўтомобіляў праяжджаюць адзін за другім. **Чарвякоў, Кнорын, Хацкевіч...**

У натоўпе ажыўленьне:

— Няхай жыве наш урад!

Гадзіньнік на Пляцу Волі паказаў 12. Плаўна падкаціліся да трыбуны аўтамабілі. І ў пяць хвілін пачарнела плошча.

* Група маленькіх дзяцей падыходзіць да вуліцы, па якой праходзіць дэмонстрацыя.

— Хай жыве Кастрычнік!

— Хай жыве Чырвоная армія!—крычаць яны, а чырвонаармейцы, ня стрымаўшыся, адказваюць:

— Ура! Няхай жыве наша зьмена!

Інваліды грамадзянскай вайны таксама вышлі на дэмонстрацыю. На кастылях, бяз рук, яны ідуць з чырвонымі стужкамі на грудзёх і іх плякат гаворыць: **«Мы ўжо пацярпелі, абараняючы заваёвы Кастрычніка, але заўсёды, у выпадку новай бойкі, падрыхтаваны выступіць з усімі, паколькі гэта будзе магчыма!»**

Сярод дэмонстрацыі селянін едзе на вярблюдзе. У яго руках сіта. Ён бярэ адтуль жменямі зярно і раскідвае па вуліцах. За ім калёны батракоў, аб'яднаных у саюз працаўнікоў зямлі і лесу.

Едзе трактар—мары кожнай вёскі. **Трактарам кіруе жанчына**. Натоўп сапраўдажне не рэплікамі:

— Э-гэ! глядзі на яе! Каб мая Марыся так дома ўпраўлялася...

Роўнапраўе значыцца. Пара ўжо—дзесяць год. Ня жарты...

* І бясконцай стракатай стужкай выцягнулася дэмонстрацыя па Ленінскай, Савецкай, Каломенскай і Карла Маркса вуліцах...

* Вечарам зноў загаварылі лёзунгі рознакалёрнымі агенькамі электрычных лямпачак, фабрыкатамі розных вытворчасьцяў, чырвонымі фарбамі...

— Няхай жыве першае дзесяцігодзьдзе!

Няхай жыве!

Н. Акцябрскі.

Карнавальная сцэнка «Мары капіталістых».

На Іванаўскай, № 15.

Усяго тры гады. І столькі зьменаў!

Я пазнаёміўся з сям'ёю рабочага **Кубеля** (завод «Пролетары») ў дні 7-й гадавіны Кастрычніка. Памятую, як Кубель адмовіўся ад удзелу ў Кастрычнікавай дэмонстрацыі, як усё сьвята правёў за выпіўкай... Памятую, як брудна ў гэтыя дні было ў яго кватэры. А з паўгоду пасьля Кастрычнікавай гадавіны ён сьвяткаваў вялікдзень. Таксама шмат піў, але падлога была чыстая і, наогул, дома панаваў сьвяточны настрой.

Так рабочы Кубель у 1924-25 годзе адзначыў два сьвяты—новае і старое.

У гэтыя дні, дні вялікага 10-годзьдзя я зноў спаткаўся з **Кубелем**. Спаткаўся на дэмонстрацыі.

Мы спачатку адзін другога не спазналі, але Кубель, прыглядзеўшыся да мяне, запытаўся:

— Памятуеце, на адной вячорцы сустракаліся... Потым з адным хлопцам знаёмым да нас разы два прыходзілі...

Я ўспомніў. Мы ішлі і Кубель апавядаў:

— Жонку абралі ў дэлегаткі. З яе ўсё і пачалося. Стала хадзіць на сходы, у клюб—на спэктаклі. Нярэдка і я за ёю валачыўся. Пазнаёміўся з адным партыйцам. У нас на заводзе іх шмат, але ніхто ня змог так добра гаварыць, як ён. Прозьвішча яго — **Казакевіч**. Праз яго я і ўцягнуўся ў працу, ну, а далейшае дома пабачыце...

Скончылася дэмонстрацыя, і мы з Кубелем пайшлі ў яго кватэру. А гэта далёка. Вось і Іванаўская, нумар 15...

Першае, што кідаецца ў вочы,—чыстата. Нейкая сьвяточнасьць. Кветкі на стале, белыя фіранкі і капы.

— Сёньня будзе вячорка,—гаворыць Кубель.

Яго дзеці—адзін піонэр, а другі—да піонэраў «нос не дарос», апранутыя ў сьвяточную бялізну, радасна вітаюць яго:

— Што, папанька, было? стралялі?..

Між іншым, на паліцы сярод белетрыстыкі заўважыў я і томік Леніна, статут УсеКП і «Азбуку Коммунизма».

Піонэр Міхась растлумачыў:

— Папанька наведвае парт'ячэйку. Хутка комуністым будзе.

З кухні высунулася галава самой гаспадыні.

— Васіль, хадзі наглядзі, як серп і молат вышлі на булцы!..

Т—э.

БЕЗ БАРЫКАД.

Кастрычнік у Менску.
(Па ўспамінах удзельнікаў).

Перадкастрычнікавыя дні ў Менску...

Прыгожыя незабываемыя дні, а разам з тым і жудасна-трывожныя для тых, хто прымаў у іх удзел, ці проста быў сьведкам тагочасных падзей.

Рыхтуюцца бальшавікі, чакаючы толькі весткі з Петраграду, каб выступіць у Менску і на ўсім Зах. фронце; рыхтуюцца таксама меншавікі і эс-эры, якія памаленьку сьцягваюць пад Менск вайсковыя часткі, якія засталіся вернымі часоваму ўраду...

Настрой гарадзкога насельніцтва—востра трывожны. Усе адчуваюць, што досыць толькі іскры, каб выбухнуў велізарны пажар. Горад прыняў вайсковы выгляд.

На вуліцах мала людзей, калі ня лічыць вайскоўцаў. Абываталь, нюхам адчуваючы набліжэньне навальніцы, сядзіць у хаце і, па магчымасьці, стараецца ня выходзіць. Чакаюць чагосьці страшэннага, небясьпечнага.

Толькі ў памяшканьні Менскага рэволюцыйнага штабу—савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў (Комуністычная, № 2, зараз будынак міліцыі) кіпіць работа. Тут нясупынна аддаюцца загады, абмяркоўваецца стварыўшаеся становішча.

Старшыня савету тав. **Ляндэр** з пачырванелымі ад бяссоніцы вачыма працуе і днём і ноччу. Тут няма рэволюцый і прыгожых слоў, як у выканкоме Зах. фронту (эгоднікім), а ёсьць напружаная дзелавая работа...

7-га лістапада выдаўся пахмуры, восеньні дзень. Усё насельніцтва, ужо ня кажучы аб савеце і бальшавіках, гатова да ўсякіх неспадзяванасьцяў, чакае з хвіліны на хвіліну вестак з Петраграду.

Прыблізна а 12—1 гадзіне атрымана радыёграма Петраградзкага вайскова-рэволюцыйнага камітэту наступнага зьместу:

> «Петраградзкі гарнізон і пролетарыят звергнуў урад Керанскага, які паўстаў супроць рэволюцыйнага народу... Народна-рэволюцыйная армія павінна затрымаць адпраўку ненадзейных, контр-рэволюцыйных вайсковых частак з фронту на Петраград. Дзейнічайце словамі і перакананьнямі, а калі не дапаможа, пашкодзьце адпраўцы контр-рэволюцыйных войскаў і ўзброенай сілай».

Атрымаўшы гэтую радыёграму, Менскі савет выдае свой вядомы загад № 1 да насельніцтва, у якім абвяшчае, што **ўлада ў Менску перайшла да савету рабочых і салдацкіх дэпутатаў**.

* * *

Пасяджэньне кулацка-сялянскага зьезду скліканага эсэрамі, на якім таксама прысутнічае вядомы Чарноў. У часе самага распалу спрэчак прыбывае вестка аб перавароце ў Петраградзе.

Нібы бомба разарвалася сярод паважных дэлегатаў зьезду. У першыя хвіліны, здаецца, чуваць было, як праляціць муха.

Але вось згоднікі заварушыліся. З пенай на вуснах пачалі яны лаяць нямногіх прысутных бальшавікоў, абзываючы іх здраднікамі, „узурпатарамі“ і нават контр-рэволюцыянэрамі...

А ў гэты час таварышы з Менскага савету хутка **вызваляюць з турмаў політзьняволеных, узбройваюць іх разам з рэволюцыйнымі войскамі і выходзяць з імі на вуліцу дэмонстраваць**.

Гэта была першая дэмонстрацыя ў Менску пасьля перавароту. З чырвонымі сьцягамі, музыкай і сьпевамі „Інтэрнацыяналу“, яна вывяла з астаўпяненьня згоднікаў. Яны хутка пачалі сьцягваць у Менск контр-рэволюцыйныя вайсковыя часткі, у якіх бальшавіцкая агітацыя ня была добра наладжана („дзікая дывізія“, “каўкаскія ўдарнікі“ ды інш.)

* * *

На долю бальшавікоў прыпала вельмі цяжкая і адказная задача: ня толькі стаць цэнтрам рэволюцыйнай улады і на Заходнім фронце, але і **абяззброіць контр-рэволюцыю ў асобе меншавікоў, эсэраў і адданых ім войск, не дапусьціць паходу апошніх на рэволюцыйны Петраград.**

Калі першая частка гэтай задачы—захоп улады бальшавікамі—была ў Менску выканана без асаблівых цяжкасьцяў і крывапраліцьця, дык другая частка здавалася тады проста неажыцьцявімай.

З аднаго боку—Менскі рэволюцыйны савет, меўшы ў сваім распараджэньні да **2 тысяч салдат**; з другога—вялікая зграя контр-рэволюцыянэраў розных масьцяў і адценьняў, пачынаючы ад меншавікоў і канчаючы проста манархістымі, якія мелі за сабой **звыш 20 тысяч верных сабе штыкоў**.

Нашы таварышы тады распачалі з ворагам, маючы на мэце адцягнуць час, дыплёматычныя перамовы. **Пакуль апошнія цягнуліся да гораду падышоў выкліканы з цэнтру браняваны цягнік і адразу зьмяніў суадносіны сіл.**

Менскі савет ужо меў у сваім распараджэньні тое, чаго яму раней не хапала—узброеную сілу, якая магла загадваць, прымусіць з ёй лічыцца.

З гэтага моманту ўлада ў Менску канчаткова пераходзіць у рукі бальшавікоў. **Адчыняецца новая старонка ў гісторыі Кастрычніка ў Менску і на ўсёй Беларусі, якая завецца барацьбой за кастрычнікавыя заваёвы.**

Я. Залуцкі.

Парасё, ускормленае атрадам — зараз лепшае парасё на сяле.

ПРАЦЯГВАЕМ АГЛЯД ПІОНЭРСКІХ ДАСЯГНЕНЬНЯЎ

Гігіена, канькі і варштат.

(Менск, атрад банкаўскіх установаў № 44).

Праца нашага атраду ажывілася з таго часу, як пачалі ўводзіць масавыя, вясёлыя моманты.

Летам праводзілі гульні на чыстым паветры, узімку організоўвалі зборы на катку, у садзе «Профінтэрн». Частка—каталася на каньках, частка—на санках спускалася з гары. Жыва праводзіліся такія зборы.

Падагульваньне працы зьвеньняў мы практыкавалі шляхам наладжваньня лётарэй на зборах. Такі мэтад даваў магчымасьць высьветліць, наскольki піонэры прапрацавалі тое ці іншае пытаньне. Гэты мэтад выклікаў спаборніцтвы з боку піонэраў на лепшыя адказы.

Цікава праводзілася заданьне аб санітарна-гігіенічным абсьледваньні піонэраў. Абсьледаваньне працягвалася больш месяца. Склалі сумесна з мэдыкам анкету, разабралі яе па зьвеньнях, а потым зьвеньні абсьледвалі адзін другога. Матар'ялы абсьледваньня абмяркоўвалі на занятках зьвеньняў. Падагульвалі недахопы ў хатнім жыцьці піонэраў, высоўвалі прапановы, што трэба і ня трэба рабіць.

Другое заданьне было: гігіена сну, кармленьня, дыханьня. Заданьне прапрацоўвалася жвава, у працягу 2-х месяцаў.

Доўга гаварылі мы аб організацыі пераплётнага гуртка. Ня было кіраўніка, інструмэнтаў. Далі аднаму зьвяну імя «пераплётчык». Той склаў плян працы, прымацавалі да зьвяна піонэра умеючага крыху пераплятаць і на першых-жа занятках узяліся за абсталяваньне варштатаў. Потым прынесьлі дошкі пабудавалі варштаты і пачалі пераплятаць. Кніг у бібліотэцы шмат, а таму і працы шмат.

Цяжка спачатку было. Клей прыходзілася варыць у хаце піонэра, і калі прыносілі яго ў клюб,—клей застываў. Але гэта ня пужала піонэраў. Нарэшце, бібліотэчныя кнігі пераплялі.

Цяпер у нас організавана пераплётная майстэрня. Працуем на заказ.

Да Кастрычнікаўскага сьвята мы правялі суботнік, правялі ранічнік на 150 чалавек.

Піонэр.

Малаток у руках піонэра.

(Рагачэў, атрад № 41).

Сумна было раней у нашым атрадзе: гутаркі, гутаркі і гутаркі... Аж абрыдла хадзіць у атрад.

Але вось абвяшчаецца выстаўка тэхнічнай работы піонэраў, абвяшчаецца конкурс на лепшую модэль.

Наш атрад з цікавасьцю ўзяўся за жывую працу. Разьмеркавалі па зьвеньнях заданьні, пабудавалі модэлі памяшканьня райвыканкому, модэль аэропляну, млына і інш. Работы па вышываньню, шыцьцю і г. д. У выніку атрымалі 2-гі прыз.

Добра рыхтаваліся і да другой выстаўкі. Пабудавалі модэль каланчы, модэль саду імя Цыммермана. Нядаўна організованы пераплётны гурток—пераплёў да выстаўкі 5 кніг. У выніку атрымалі першы прыз.

Цяпер піонэры з вялікай зацікаўленасьцю працуюць у пераплётным гуртку, рыхтуюцца да атраднай выстаўкі.

Маецца ў нас цяпер добры матар'ял па якасьці, ды і модэлі ўжо не параўнаеш з ранейшымі. Да гэтай выстаўкі мы пабудавалі модэлі кооперативу, сялянскай хаткі, рабочага клюбу, модэль аэропляну.

Фіныштэйн.

У саюзе з аграномам.

(Копыль, Меншчына).

Побач з нашай школай знаходзіцца школьны сад і агарод. Яшчэ ў 1925 г., па ініцыятыве піонэраў вучні сямігодкі організавалі экскурсію ў савхоз Канорычы. Там мы купілі дрэўцаў дзеля засадкі нашага саду. Сад пры дапамозе агранома быў засаджаны вучнямі, які цяпер добра прыняўся. У гэтую вясну двума клясамі сямігодкі быў апрацаваны агарод па ўсіх правілах агрономіі.

У агародзе былі пасеяны буракі, турнэпс, бручка, капуста, моркаў, бульба, пшаніца, авёс і ячмень.

Ураджай быў добры. Гэта дасягненьне. Але дрэнна тое, што не скарысталі добра гэтага ўраджаю.

Цімашок.

Парасё, ускормленае атрадам — лепшае на сяле.

(Коханава, Аршанскай акругі).

З пераходам на летнюю працу, сельсавецкі атрад імя Сталіна ўзяўся за выкананьне сельска-гаспадарчых заданьняў. Аднаму зьвяну атрад даў заданьне гадаваць сьвіней, другому—выкармліваць курэй, трэцяму—закласьці градку, чацьвёртаму—весьці барацьбу з прусакамі і блохамі.

Піонэры двух зьвеньняў узялі ў сваіх бацькоў пару парасят, пару куранят і колектыўна, кіруючыся кнігай і парадамі агранома, усе лета кармілі сваіх „пітомцаў“.

Вырасьлі за лета парасяты вагою ў тры пуды кожны. Піонэрскія кураняты, важылі па 10 фунтаў кожны.

Малодшае зьвяно на сваіх градках вырасьціла буракі па 7 фунтаў, і цыбулю па 1 фунту кожная.

Прыходзілі сяляне, дзівіліся, гледзячы на працу піонэраў. І гэтым самым атрад заваяваў сярод насельніцтва значны аўторытэт.

Захараў Юрка.

У кожнага піонэра — на браме скварэчня.

(Глускі раён, Бабруйшчына).

Летам піонэры атраду пры Патапенскай комсамольскай ячэйцы выконвалі заданьні па ахове птушак і лясоў, па барацьбе з мухамі са шкоднікамі агародаў. На стрэхах, брамах піонэры павесілі скварэчні, прываблівалі птушак у летнія кватэры. Праводзілі сярод неорганізаваных дзяцей гутаркі аб карысных птушках. У выніку—зьменшылася разбурэньне птушыных гнёздаў.

3 дзесяціны лесу ачысьцілі піонэры ад сьмецьця і рознага сухога гальля. Павялі барацьбу з псаваньнем лесу, правялі гутарку аб ахове лесу ад «чырвонага пеўня».

Улетку атрад прапрацаваў пытаньне аб паляводзтве, садаводзтве, організаваўшы экскурсіі ў пітомнік, у поле, агарод.

Каган.

Аб удзеле ЛКСМБ у партыйнай дыскусіі.

Пастанова бюро ЦК ЛКСМБ.

1. Бюро ЦК ЛКСМБ вітае пастанову VI пленуму ЦК УсеЛКСМ па пытаньні аб XV зьездзе УсеКП і задачах комсамолу і цалкам да іх далучаецца.

2. Грунтуючыся на пастановах пленума ЦК УсеЛКСМ бюро ЦК ЛКСМБ пастанаўляе:

а) правесьці ў лістападзе месяцы і закончыць да 1 сьнежня ў гарадзкіх організацыях акруговых цэнтрах і ва ўсіх вытворчых ячэйках абмеркаваньне асноўных пытаньняў партыйнай політыкі, на грунце проэктаў тэзысаў ЦК УсеКП да XV партзьезду.

б) лічыць неабходным увязаць абмеркаваньне партыйных пытаньняў у комсамоле з абмеркаваньнем важнейшых пытаньняў работы саюзу на грунце палажэньняў высунутых апошнім пленумам ЦК УсеЛКСМ (гл. разьдз. рэзолюцыі пленуму аб падрыхтоўцы прапаноў аб комсамоле да XV партзьезду).

в) акругкомы і райкомы павінны забясьпечыць дзелавое і таварыскае абгаварэньне ў ячэйках ЛКСМБ усіх паказаных вышэй пытаньняў.

г) абмеркаваньне тэзісаў праводзіць па комсамольскіх ячэйках пасьля абгаворэньня тэзысаў мясцовымі (пры данным прадпрыёмстве, установе) партыйнымі ячэйкамі.

д) у местачковых і вясковых організацыях саюзу правесьці растлумачальную работу аб задачах XV партыйнага зьезду. Растлумачэньне павінна быць праведзена ва ўсіх местачковых і вясковых ячэйках. Пры адсутнічаньні патрэбнай колькасьці прапагандыстых дапусьцімы групавыя, альбо куставыя сходы ячэек.

е) у мэтах уцямленьня сэнсу і характару ўдзелу саюзу ў партыйнай дыскусіі абгаварэньню тэзісаў ЦК УсеКП у гарадзкіх ячэйках павінны папераджаць сходы актыву на якіх абгаварваецца рэзалюцыя VI пленуму ЦК УсеЛКСМ «аб XV зьезьдзе УсеКП і задачах комсамолу».

ж) усе сябры саюзу ўдзельнічаюць у абгаварэньні тэзісаў ЦК УсеКП і пытаньняў саюзнай работы на агульных сходах комсамольцаў па сваім ячэйкам.

з) бюро ЦК зварачвае асаблівую ўвагу акружкомаў на абавязковае прыцягненьне ўсіх комсамольцаў—сяброў і кандыдатаў партыі да абгаварэньня тэзісаў на сходах комсамольскіх ячэек.

і) прапанаваць „Чырвонай Зьмене“ пачаць на старонках газэты растлумачальную работу па пытаньням удзелу саюзу ў партыйнай дыскусіі, забясьпечыць высьвятленьне ходу абгаварэньня пытаньняў у комсамольскіх ячэйках.

к) абавязаць акруговыя камітэты праз кожныя два дні інформаваць бюро ЦК аб ходзе абмеркаваньня пытаньняў у організацыях саюзу.

л) прасіць ЦК КПБ даць дырэктыву ўсім партыйным організацыям аб вылучэньні падрыхтаваных партыйцаў-прапагандыстых на дапамогу комсамольскім ячэйкам пры абмяркоўваньні і растлумачэньні тэзысаў ЦК УсеКП.

м) прасіць ЦК КПБ даць дырэктыву партыйным організацыям аб забесьпячэньні комсамольскага актыву неабходнай партыйнай літаратурай.

РЭХА „СУБОТНІКАЎ“.

Суботнікі прайшлі па Беларусі з вялікім посьпехам. Зараз зьмяшчаем рэшту матар'ялаў аб іх правядзеньні.

Водгукі суботніка.

Вёска Доўбесьня. 60 комсамольцаў будуюць пажарны хлеў. Апрача 60, дапамагае ячэйцы і 40 старых сялян.

Хлеў канчаткова будзе закончан да Кастрычніка.

В. Любонічы. 24 комсамольцы, вышлі ў лес пілiць дровы. Некалькі дзён працы далі 50 р. заробку.

В. Ахвочыцы. 15 комсамольцаў і 55 беспартыйных старых сялян згадзіліся будаваць бедняку хату.

Быў організаваны сход удзельнікаў. Сход выпрацаваў падрабязны і дакладны плян удзелу кожнага ў суботніку.

23 кастрычніка пачаўся суботнік. За дзень пастаўлены зруб. Засталося толькі пакрыць.

„Новае жыцьцё“ (яўрэйская арцель). Удзельнікі суботніку,—усе сябры арцелі.

Арцель рамантуе дарогу на працягу поў вярсты.

— Мевская профшкола друкароў зарабіла сто рублёў.

— **У Парычах** (Бабруйскай акругі) сябры профсаюзу „рабземлес“ ачысьцілі 8 дзесяцін лесу. Зарабілі 28 рублёў.

М. Н.

— **У вёсцы Крушынаўка. Рагачэўскага раёну**—вяскоры адрамантавалі мэблю ў школе і зрабілі абсталяваньне для чырвонага кутка.

Я. Савіцкі.

— **У Барысаве** комсамольцы савецкіх установаў зарабілі 30 рублёў.

Б. Шапіра.

— **Бягомльскі раён. Меншчына.** Рамантавалі дарогу. Удзельнічала 40 комсамольцаў і 4 беспартыйных. Зарабілі 42 рублі.

Нідальская ячэйка у ліку 18 чалавек зарабіла 22 рублі.

НА ВАРЦЕ МЕЖАЎ.

Экзамен вытрымалі.

(Г. Віцебск).

6 гадзін раніцы. На двары ветрана і даждліва. Але комсамольцам—гэта нічым. Яны жыва сабраліся на зборны пункт і, атрымаўшы вінтоўкі, хутка пайшлі да вучастку абароны.

Дарога дрэнная, размокшая.

На абаранцельным рубяжы настаражыліся. Падрыхтаваліся.

Вораг, карыстаючыся ўзгоркамі мясцовасьці, хутка абрушыўся на нашы войскі

Завязаўся гарачы бой паміж „чырвонымі“ і „сінімі“. „Чырвоныя“ ня вытрымалі і пачалі адступленьне.

А ў горадзе ў гэты час вораг зрабіў паветраны налёт. Чутны сірэны. Авіяхім-каманды за работаю—адбываецца нэйтралізацыя заражаных месц.

Бой скончыўся. І „сінія“ і „чырвоныя“ зноў разам. Чутны жарты. Жыва абгаварваюць, хто каго перамог.

І стройнымі шэрагамі наша комсамолія зварачаецца ў горад, з поўнай упэўненасьцю, што экзамэн вытрымалі.

Гайко.

Заўсёды гатовы быць армейцамі.

(Вільшчынская ячэйка ЛКСМБ, Койданаўскі раён).

Пры нашай ячэйцы організаваны гурток па вывучэньню строю, у якім займаюцца ўсе комсамольцы і беспартыйная моладзь. Заняткі праводзяцца тры разы ў тыдзень. Другі гурток, па вывучэньні вінтоўкі і нагану працуе адзін раз у тыдзень. Зьяўляюцца на заняткі ўсе вучні нашае ШСМ, слухаюць з увагаю кожнае тлумачэньне. Трэці—санітарны гурток—абхоплівае сабою ўсіх дзяўчат, праца якога не адстае ад іншых гурткоў.

Больш актыўныя комсамольцы ходзяць у бліжэйшую вёску Станькава і там праводзяць вайсковыя заняткі.

За кароткі час мы навучыліся маршыраваць зьбіраць і разьбіраць вінтоўку, а дзяўчаты,—як аказаць першую дапамогу раненым.

Міхась Маркевіч.

Чырвонафлётцы абгаварваюць дзейнасьць Ленінград-савету.

Яшчэ задоўга да справаздачнай кампаніі Ленінградзкага гарсавету, на ўсім кубрыкам і казэматам лінкору былі вывешаны кампавійскія лёзунгі і плякаты. Прырастаюць да іх групкамі чырвонафлётцы, каб загадзя азнаёміцца з дзейнасьцю свайго савету.

Але вось і справаздачная кампанія. Па кубрыках ідуць сходы. „Сачкоў“ амаль няма.

Плаўна цячэ прамова дакладчыка, насычаная лічбамі. Яскрава растуць перад вачыма сабраўшыхся дасягненьні савету. Крок за крокам разгортваюцца малюнкі ўзросту гораду Леніна. Ніводнае слова не прапушчаецца чырвонафлётцам.

Сур'езна і дзелавіта патрабуюць чырвонафлётцы адказу па шэрагу ня зусім ясных для іх пытаньняў:

— Чаму слаба працавала ваенная сэкцыя Чаму перабоі ў забесьпячэньні прадметамі першай неабходнасьці ў горадзе? Чаму мы згадзіліся плаціць Францыі даўгі?..

Адказ дадзен. Праца савету прызнана задавальняючай.

Разабраўшы ўсебакова працу свайго савету, чырвонафлётцы цьвёрда ўпэўнены ў яго далейшых дасягненьнях.

Марскі вечар.

У мястэчку **Бярэзіна** ў дзень гадавіны комсамольскага шэфства над флётам быў скліканы сход моладзі. Сход заслухаў даклад аб флёце і дапамозе, якую яму павінен аказваць комсамол.

Сабралі 15 рублёў, на якія закупілі падшэфным літаратуры.

Марскі вечар прайшоў дужа ўдала.

Каўцэвіч.

Самалёт гатоў.

У працягу некалькіх месяцаў сярод працоўных БССР праводзіўся збор сродкаў у фонд пабудовы авіё-эскадрыльлі — **„Наш адказ Чэмбэрлену“.**

Зараз гэтая эскадрыльля ўжо гатова. Адно з першых месц у ёй займае самалёт **„Комінтэрн“, пабудованы на ахвяраваньні сабраныя ў Беларусі.**

8-га лістапада ў Маскве адбылася ўрачыстая перадача новай эскадрыльлі паветранаму флёту СССР, на якой прысутнічалі 3 прадстаўнікі Бел. ТСА-авіяхіму.

Міжнародны агляд

Дзень за днём.

На конфэрэнцыі па разброеньні будзе ўдзельнічаць і СССР. —Ангельскай буржуазіі гэта не падабаецца.—Замежныя дэлегаты пераканаліся ў пасьпяховым будаўніцтве соцыялізму ў СССР.

СССР і конфэрэнцыя па разброеньні.

30 лістапада ў Жэневе (Швэйцарыя) адчыняецца падрыхтоўчая конфэрэнцыя па разброеньні.

Конфэрэнцыю гэту склікае Ліга Нацый. Ня так даўно сакратар Лігі зьвярнуўся да Наркома па замежных справах з прапановай, прысланць сваіх прадстаўнікоў на конфэрэнцыю.

Яшчэ да атрыманьня гэтага запрашэньня т. Чычэрын накіраваў сакратару Лігі тэлеграму у якой падкрэсьліваў, што ў сучасны момант, пасьля ліквідаваньня конфлікту між СССР і Швэйцарыяй, няма ніякіх перашкод да ўдзелу Савецкага Саюзу ў конфэрэнцыі.

Цікава тое, што ангельскі друк шмат аддае ўвагі гэтаму рашэньню СССР.

Рабочая газэта, а таксама і некаторыя буржуазныя газэты, якія адносяцца варожа да сучаснага ўраду, вітаюць удзел СССР ў конфэрэнцыі па разброеньні.

Наадварот, ангельскі ўрадавы друк імкнецца захаваць сваё нездавальненьне ўдзелам савецкіх дэлегатаў на конфэрэнцыі.

Некаторыя-ж ангельскія газэты пішуць, што прысутнасьць савецкіх дэлегатаў на конфэрэнцыі паставіць ангельскі ўрад у дрэннае становішча.

Ня гледзячы на англа-савецкі разрыў, прадстаўнікі Англіі прымушаны будуць гутарыць з прадстаўнікамі СССР.

Тое-ж самае пішуць амаль ня ўсе нямецкія газэты.

Разам з тым напамінаюць, што да гэтага часу суседнія з СССР дзяржавы (намёк на Польшчу), кожны раз адмаўляліся ад скарачэньня ўзброеньня.

Прычынай гэтаму зьяўлялася нібыта нагроза з боку СССР, які не жадаў прымаць удзелу ў конфэрэнцыях па разброеньні.

Пастанова савецкага ўраду,—пішуць нямецкія газэты,—кладзе канец усім гэтым адмаўленьням.

Комуністычная газэта Нямеччыны тлумачыць прычыны нездавальненьня Англіі удзелам СССР на конфэрэнцыі.

Яна піша, што прадстаўнікам Англіі ня лёгка будзе рабіць свае цёмныя справы ў прысутнасьці савецкае дэлегацыі.

Якраз таму—падкрэсьлівае газэта,— ангельскі ўрад прыкладае ўсе сілы, каб трымаць Савецкі Саюз далёка ад конфэрэнцыі па разброеньні.

Пастанова Савецкага ўраду паблытала ангельскія пляны.

Замест хлусьлівай балбатні капіталістых аб разброеньні, якою яны захоўваюць шалёны рост узброеных сіл, СССР на конфэрэнцыі пакажа сваю політыку міру.

У краіне соцыялізму.

Перад сьвятам прэзыдыум Вышэйшага Савету Народнае Гаспадаркі прыняў замежныя рабочыя дэлегацыі, што знаходзяцца ў Маскве.

Пасьля ўзаемнага прывітаньня, т. Куйбышаў зрабіў дэлегацыям кароткае паведамленьне аб становішчы нашае прамысловасьці.

З прамовай ад імя ўсіх дэлегатаў выступіў прадстаўнік Нямеччыны т. Вэйс.

«Дэлегаты,—сказаў ён,—глыбока задаволены тым, што яны мелі магчымасьць запроста пагутарыць з кіраўнікамі савецкай прамысловасьці, што нямысьліма ў капіталістычных краінах.

Дэлегаты знаходзяцца ў СССР усяго некалькі дзён, аднак, ужо і цяпер яны могуць констатаваць вялізарныя посьпехі Савецкай краіны ў аднаўленьні разбуранай вайною гаспадаркі.

Усюды відаць, што працоўныя Саюзу аддаюць усе свае сілы на будаўніцтва соцыялізму.

Эўропэйскі пролетарыят разумее, што яшчэ 5-10 год мірнага будаўніцтва і Савецкі Саюз зробіць такія вялізарныя посьпехі ў сваім соцыялістычным будаўніцтве, што нават выперадзіць капіталістычныя краіны.

Працоўныя іншых краін, якія таксама імкнуцца да соцыялізму, аддадуць усе свае сілы, каб перашкодзіць усякаму нападу буржуазіі на краіну Саветаў.

Яны добра ведаюць, што паражэньне СССР было-б паражэньнем усяго сусьветнага пролетарыяту.

— Асабліва моцнае ўражаньне,—падкрэсьліў Вэйс,—зрабіў на працоўных Эўропы маніфэст савецкага ўраду аб падрыхтоўцы да пераходу на сямігадзінны працоўны дзень.

Гэты акт сьведчыць аб вялізных посьпехах соцыялістычнага будаўніцтва ў СССР. Пасьля звароту на бацькаўшчыну, дэлегаты аддадуць усе сілы на стварэньне адзінага фронту, супольна з працоўнымі Савецкага Саюзу, для барацьбы супроць наступленьня капіталу на соцыялізм».

Алёнін.

Літаратурная старонка

Іл. Барашка.

Поэта сучаснасьці.

Дзіця гораду, узгадаваны Вялікім Кастрычнікам, малады беларускі поэта—комсамолец Андрэй Александровіч зьяўляецца адным з буйных талентаў у беларускай рэволюцыйнай літаратуры. Яго творчасьць больш за ўсіх набліжаецца да беларускай пролетарскай літаратуры.

Ня так даўно вышла з друку новая кніжка поэзіі Андрэя Александровіча—„Угрунь“, якая зьвяртае на сябе ўвагу паўнатою зьместу, мастацкай шчырасьцю і праўдзівасьцю, чым выгадна выдзяляе А. Александровіча з шэрагу найновых мастакоў беларускага слова ў асобную адзінку.

„Угрунь“—трэцяя ступень творчасьці маладога поэты А. Александровіча. Сьпярша „На беларускім бруку“, затым „Прозалаць“, і цяпер „Угрунь“. „Угруньню“ А. Александровіч вытрымаў экзамэн для пераходу на чацьвёртую ступеньку. У той час, як творчасьць некаторых маладых поэтаў прыпыняецца, у творчасьці зьяўляецца крызіс (поэта альбо пакідае пісаць, альбо піша так, як пісаў летась, альбо пазалетась, альбо ўдараецца ў абрыдлую ўсім—так зв. „голую лірыку“, у якой ні сэнсу, ні зьместу), творчасьць А. Александровіча расьцьвітае, прыносячы ў беларускую літаратуру новыя па каштоўнасьці ўклады.

Яго поэзія—„віратлівы разьбег жыцьця“. Усё тое, што адбывалася і адбываецца на вачу ў поэты, ён аздабляе ў мастацкую форму, простую, зразумелую, і падае чытачу. Чытаеш зборнік „Угрунь“, пераконваешся шчырай праўдай, і хочацца разам з поэтам сынтэзаваць, як сынтэзуе ён ў адным з вершаў:

„Імчыцца ўгрунь
„Жыцьця разьбег!..

Разьбег жыцьця імчыцца ўгрунь. Пасьпявае ісьці, ляцець з жыцьцём толькі той, хто сам будуе гэтае жыцьцё. А. Александровіч—разам з жыцьцём. Таму яго творчасьць—наша эпоха, эпоха Кастрычніка.

Мілагучны разьмер вершаў, вытрыманы ў значнай ступені рытм вершу А. Александровіча цесна зьвязаны з тэматыкай.

Надзвычайна мастацка адбіта ім уся дакастрычнікаўская эпоха ў адным з буйнейшых яго твораў, што ўвайшлі ў зборнік «Угрунь», у поэме „Дваццаць».

„Дваццаць“—гэта споведзь поэты, гэта яго аўтобіографія. Але „Дваццаць“—гэта ня толькі споведзь. У поэме «Дваццаць» адбіта жыцьцё гарадзкога пролетарыяту.

У той час, калі:

«У горадзе звонка,
вітрыны, агні;
гудуць беспрасонку
і ночы і дні.

У той-жа час:

Глуха ў завулках
беднота, гальлё.
Лахмоцьце прытулак
падпольлю дало.
Ірвецца з падпольля:
—Далоў царскі стан,
Ня будзе Менск болей
Кафэ-шантан.

(«Угрунь» ст. 94).

Але вось прышла, пранеслася навальніца—рэволюцыя:

Былі часы, разносіў вецер іскры!
Матуля добрая,
успомні тыя дні.
І ўноч і ўдзень
прыносіў нам вятрыска
і страх і дым,
і голад,
і агні...

Навалаю навісьлі адна за другою, сьпярша нямецкая, потым польская окупацыі над Беларусьсю. І толькі ліпень дваццатага году прынёс вызваленьне:

Мінула ноч...
Замоўклі кулямёты...

Над пажарышчамі
віўся дымны чад.
З склепу вылезьлі,
на плошчу зноў я зьлётаў:
— Прышлі! Чырвоныя!
Чырвоныя!
... Парад!

(„Угрунь“ ст. 105).

Прышлі Чырвоныя. Пагасілі пажарышчы, пакінутыя гораду ў спадчыну ад нанаваньня палякаў. Іншае жыцьцё. Хто ня памятуе з нас гадоў страшэннай разрухі, голаду, што навісьлі былі над гарадзкім пролетарыятам і так мастацка адбіты А. Александровічам:

Холадна. Застыў
шумлівых вуліц гул.
Бягу ў „капэратыў“
Раней заняць чаргу.
Поўна галава
радасьці, надзей,—
будуць выдаваць
воблу і алей..

Які праўдзіва-прыгожы абразок таго часу:

Вогнішча расклалі.
Холадна. Мароз.
Рана паўставалі.
Выцягнуўся „хвост“...

І ў гэтым самым славутным „хвасьцё“:

Пішуць для парадку,
крэйдай, як на норме,—
на грудзёх, на латках
кожнаму свой номер...

(„Угрунь“, ст.106-107).

Горад галодны. Хлеба і за грошы ня купіш. І вось:

За вёрст сямнаццаць мы, а можа й далей
ішлі ў абмен пуцінай сьнежна-сіняй
і несьлі—хто цьвікі, хто хустку, хто гадзіньнік
і ўсе авеяны пяшчотамі надзей.

Негасьцінна прымала вёска ў той час „мяшэчнікаў“ з гораду:

Мінаем хаты мы... Палёў гаспадары
прымаюць нас далёка негасьцінна:
даюць нам для пацехі бульбы поўасьміны,—
а мароз узводзіць белыя муры.

Але, каб „ісьці ў абмен“, патрэбны былі рэчы. У галыцьбы няма і іх. Усе распрададзены. Зарабіць няма дзе. Нэрвуецца рабочы:

... Так тваю маць!.. Дзе-ж хлеба дастаць?

Трупам на вуліцы ляжаш!
Ой, галыцьбе
дык самога сябе,
сябе,—
за рубель,
— рас-пра-дажа!

(„Угрунь“, ст, 111).

Гарадзкі пролетарыят на сваёй сьпіне перанёс і гэтую жудасную эпоху. Згаладалы, змучаны ў барацьбе ён дачакаўся іншых дзён:

Пазвала жыцьцё за напружную працу,
бо ў спадчыну нам ад прышэльцаў былых—
на фабрыках нашых разьбітае, братцы,
разьбітае ўсё—варштаты, катлы,
і сьцены ўзарваны, і толькі руіны
раскінутай цэглы і як-жа тут быць?
Пазвала жыцьцё адбудоўваць краіну
пасьля перамогі. **ля барацьбы.**

(„Угрунь“ ст. 112).

Пачынаецца адбудова краю. Пролетарыят у саюзе з сялянствам будуе сваю дзяржаву рабочых і сялян. Адгукваецца А. Александровіч і на гэта:

Эх, сасоньніца-сасна,—
дні суровыя...
Бервяно да бервяна—
Хата новая.

(„Угрунь“) ст. 9).

Вось ён, рытм нашага будаўніцтва:

Гэй-жа, разам!
Гэй-жа разам!
Гэй!
Адразу
возьмем
разам!
Гуртам!
Дружна!
— хлопцы здужым!
Гэй, яшчэ!
яшчэ!
яшчэ!
Будзе сонца
зьзяць ярчэй.

(„Угрунь“ ст. 11).

Поэта разам з жыцьцём. Ён не адстае ні на крок:

„Пайшоў і я дарогай камяністай,
пайшоў з рабочымі пад сьвіст ліхіх віхур.
Пайшоў бадзёры я, з прыпеўнасьцю агністай!
І сёньня разам я з грамадай камуністых
за цэглай цэгліну ўкладаю ў **новы мур...**

(„Угрунь“ ст. 121).

І радуецца поэта. А радавацца ёсьць чаму, калі з жыцьцём ты побач йдзеш:

Як глянеш, сэрца радуе:
будуем новы лад.

А. Александровіч адгукваецца сваёю творчасьцю на ўсе праявы сёнешняга дню. Не ў „жоўталісьці кучаравых дубоў“, не ў „неабсяжных долях“—аснова для яго творчасьці. Беларускі брук, поўны віратлівага разьбегу жыцьця, — вось дзе крыніца творчасьці таленавітага поэты. Цьвёрдая, упартая, як літара „р“—яго творчасьць. Няма сьлюнявасьці, „шуканьня шуканьняў“.

На лева—
левую!
Я заклікаю,
стройна!
Краіна родная!
Сягоньня твой **парад!**
Пяю ня лірыку,
а экопом-надстройку
пра рост чырвонца,
пра наш Савецкі лад.

(„Угрунь“, ст. 26).

Беларускі брук — пролетарскі Менск, управе гардзіцца тым, што ўзгадаваў свайго поэту—А. Александровіча, для якога, як і для ўсіх працоўных Савецкай Беларусі:

Радасьцю сьветлай,
як сэрца поэта.
цьвіце залаціста
мая Беларусь!

(„Угрюнь“, ст. 42).

Для якога—„агні віднеюцца далёкіх берагоў“, якія адгукаецца на гудкі заводаў і фабрык, які верыць у тое „новае, агністае сьвітаньне Сярпа і Молата над злучанай зямлёй“, і разам з працоўнымі „паглінкаю румянай будуе новыя, нязнаныя для Беларусі дні».

Пра „ляпаніну капытамі“.

У газэце «Зьвязда», была зьмешчана рэцэнзія П. Брусьніцы, пад загалоўкам «На брыдкім шляху» на зборнік вершаў **П. Труса** «Ветры буйныя».

Трэба сказаць, што аўтар артыкулу «На брыдкім шляху» пайшоў па брыдкім шляху, як крытык, таму што ён падышоў да справы вельмі аднабока і тэндэнцыйна. Брусьніца абвінавачвае крытыкаў папярэдняга зборніку вершаў **П. Труса** ў аднабокасьці—пахвальбе поэты. Ён пытаецца:

— Ці мелі рацыю папярэднія крытыкі, калі яны яшчэ ў зародку ўзьнесьлі да нябёс маладога поэту?

Ці так гэта? Не! Папярэднія крытыкі былі правы, што «узьнесьлі да нябёс» маладога поэту, бо яны былі ня так «футурыстычна» настроены супроць Труса. Яны бачылі, што П. Т. «поэта ў зародку», але гэты «зародак» здаровы, і таму яго трэба гадаваць. Цяпер-жа П. Т. выпусьціў другі зборнік. Як бачым, першым крытыкам зьявіўся П. Брусьніца.

Прабегшы павярхоўна па артыкуле П. Б., кідаецца ў вочы нездаровы ўхіл у крытыцы—пагаліць (ляпнуць капытом).

Брусьніца кажа, што ў Труса няма прогрэсу. А даводзіць гэта наш паважаны крытык, узяўшы па страфе з трох вершаў. А ў зборніку «Ветры буйныя», каля поўсотні вершаў (а строфаў?). Які поўны, дасканалы аналіз!

Брусьніца абураецца на П. Т. за тое, што ён «перапявае старое», а прыкладам гэтага не падмацоўвае (мабыць, не знайшоў).

— Пачакайце,—кажа ён,—што вы скажаце на тое, што П. Т. займаецца пераймальнем у іншых поэтаў. Я даю аж тры прыклады! (Як шмат! М. М.).

Паглядзім ці «абакраў» Трус Купалу? Не. Трус ня вінаваты ў тым, што для таго, каб даць пэўны вобраз, трэба ўжыць адпаведныя словы, якія сустракаюцца і ў Купалы і іншых поэтаў. Ня выдумліваць-жа П.Т. новых слоў для сваіх вобразаў і вершаў, каб іх ніхто не разумеў, як гэта сустракаецца ў некаторых поэтаў. Прыклад з Шэўчэнкам таксама няўдалы, бо ёсьць і народная песьня, дзе пяецца:

„Плыве човен, вады повен, каб ён ды разьліўся“ і г. д.

Брусьніца-ж мае сьмеласьць сказаць, што гэта з Шэўчэнкі.

Па-другое, поэта і сам кажа, што любіць успамінаць Шэўчэнку:

„Мо таму ў маіх песенных плынях
Успамінала ня раз ты Шаўчэнку“...

У Труса ёсьць перайманьні. Але ці гэта загана П. Т. Хто яму забароніць вучыцца ў вялікіх поэтаў? Мы ведаем, што Пушкін пераймаў Байрона, Лермантаў Пушкіна і г. д., што не перашкодзіла ім стаць славутнымі поэтамі. Калі сустракаецца ў зборніку П. Т. «Ветры буйныя» нешта падобнае да Пушкінскага, Шаўчэнкавага, дык гэта гаворыць аб тым, што яны зрабілі на яго ўплыў. Але ж гэта нельга абвінавачваць П. Т. у «злодзействе», бо нездаровага ў гэтым няма.

«Гэроіняй« вершаў П. Т. у зборніку «В. Б.»—вёска. Трус пяе ўжо пра тую вёску, дзе:

„У зяленай цьвецені
Купаюцца сады...
Пад рогат—сьмех
Задорна малады
На ўзмахі вёсел
Коціцца жняярка...“

Хоць Брусьніца і кажа, што зборнік вершаў П. Т. «В. Б.» «з усіх пісьменьнікаў пакрысе» г. зн. неорыгінальны, аднак гэта няпраўда.

А вось што некаторыя нашы «крытыкі» твораць ня — **крытыку**, а «ляпаніну капытамі»—дык гэта так.

М. М—ч.

Сяргей Фамін.

* * *

Перазвонамі стазвоннымі
Празваніла восень клёнамі,
Калыхнула сосны сонныя
Калыхнула засмучоная.
Муць туманная, глыбокая.
Думкі—сьцежкі дзеразовыя
У думках сьветлых—каравокая,
Шчасьце вуснаў—пурпуровае...

. . . .

Усё мінецца, ўсе пракоціцца
Каляровымі лятункамі
Пачынаецца ўсё—гліцамі
Адмірае—разрахункамі.
Да каханьня—сэрца ласае
Помню, глянуў—расьсьмяялася...
...Дарагім за вершы зваўся я
Ты за вочы—падабалася...
Ну, а потым—смуць прадонная:
Разьвіталіся у гонях мы...
... Перазвонамі стазвоннымі
Празваніла восень клёнамі...

Восень 1925 г.

Перапіска з супрацоўнікамі.

Піонэру Касаджыкаву, Законьнікаву (верш „Бяжы мой конь...“), **Іл. Дуброўскаму** (верш „Віхар“), **С. Мініну** (верш „Сталёвая птушка“), **Б. Восінаву** (верш „Кастрычнік“), **Ю. Гадлеўскаму** (верш „Восень“), **А. Міхонскаму** Асташку (хут. Палесьсе), **П. Раздольнаму** (верш „Напярэдадні“), вучню Крычаўскай сямігодкі (верш „З чырвоным сьцягам“), **П. Пруднікаву, Максімаву** (г. Горкі), **Ян. Жуку** (апав. „Дачушка“), **Я. Пашкевічу** (верш „Жыцьцё)—не падыходзяць да друку.

У. Шыдлоўскаму (Менскі Белпэдтэхнікум). Плагіят творчасьці не дазваляецца, а ты „пазычыў“ верш расійскага поэты Някрасава „Восень“—і падпісваеш сваё прозьвішча...

Вось паглядзі:

У Някрасава.

Поздняя осень, грачи улетели,
Лес обнажился, поля опустели,
Только не сжата полоска одна,
Грустную думу наводит она...

У цябе.

„Нудная восень, лісты пажаўцелі,
Птушкі у вырай даўно паляцелі,
Гразь ды сьлізгота, холадна стала,
Сонца агністае сьвеціць нам мала...“

Ну, хто ў каго сьпісаў? Нельга так.

Васіль Каваль.

Новыя дні.

(З апавяданьня).

...Вёска Аўсяная зусім блізка прытулілася к гаю—сьцюдзёна ёй, падперазалася серабрыстай істужкай—ракою. Крычалі зграямі вароны, раскаціста і глуха брахалі сабакі, калі зьбіраліся людзі, дык чамусьці гаварылі—то прыцішана, то буйнымі і крыклівымі галасамі, поўнымі злосьці...

Амаль усе з маладых хлопцаў былі на вайне. І вось прыходзілі весткі нядобрыя: адным—«заказаў бог доўга жыць», другія пакалечаны. І плакалі старыя бацькі па сынох...

З балючым сэрцам заўжды зьбіраліся мужыкі ў закопчанай хаце Ягора сумнымі вечарамі зімы. Шугала полымем лучына, дым закопчваў столь. За чорнай шыбай вакна вецер сьпяваў нібы хаўтуры ці памінкі па кім-нібудзь, дзе-небудзь.

Стары Ягор, седзячы на запечку, успамінаў старое, разьедзенае дымам. Бяз зубоў, шамкаючы гаворыць—з хрыпам, з надломам у грудзёх, і толькі ківае сівай барадой, ды ў вачох блісcкучых і сумных—загарыцца часам агнёвасьць. Грудзі сьцісвуцца, запылаюць думкі.

— Вось як жылі!—скажа так.

Міжвольна апусьцяцца рукі. За жальбою—імкненьне ўперад, а гады на старых пацёртых плячох—гады!.. Бо былі-ж некалі маладыя: тады ў грудзёх узьнімаліся сінія хвалі...

— Эх, каб сіла,—сьціскаўся жоўты кулак.

Зналі: сыны недзе ваююць за праўду, яшчэ за цара... а больш нічога ня ведалі. Таму і старая маці (шмат перанесла гора) пахіліць галаву, а ў вачох... вільгаць.

Пісьменны, водзячы заскарузлым пальцам па радкох газэты, няўмелым махам мужыцкай рукі паясьняў навіны, а кожны думаў:

— А што-ж будзе?

Тады гуляла і кружылася мяцеліца, сумёты сьнегу ляжалі, а прыехаўшы з фронту Захар Ягораў прывёз вестку:

— Цара больш няма!

Тры словы, сказаныя трохі насьмешліва, узбунтавалі мужыкоў—заварушылася хата, загалдзелі, загаманілі:

— Як-жа так?

— А што-ж то будзе, родныя-га-а?

Хто-ж намі кіраваць будзе—цар быў—і няма!

Захар—шырокі ў плячох, рукі—лапы мядзьведзя. Твар высечаны з цьвердага і грубага—устаў сярод мужыкоў. І мужыкі—барадатыя, маршчыністыя, галодныя па думы—патрабавалі, каб ён сказаў ім самае праўдзівае і важнае.

Расьсек правай рукою густое паветра ў хаце, ухмылка зглядзіла страх мужычы.

Няма цара і ня трэба! Чаго вы спужаліся, га-а.? А за што вашы гінулі на вайне тысячамі тысяч?.. Скажаце, за што памiралі вашы сыны?—За цара і паноў!—вось што! Ня трэба нам вайны і цара злодзея... Самі мы будзем кіраваць. Таму—мы сіла, а ня цар і паны!

Голас яго—грубы і ахрыплы—рос і грымеў.

— Нас многа, а цар з панамі ды генэраламі верхаводзіў намі. Таму ня было сілы. А зараз—сіла гэта ёсьць... Ёсьць, кажу вам... З усіх бакоў падымаецца яна, і ўбачыце вы — так закружыцца сьвет, зямля кругом заходзіць. Таму мы сіла вялікая—разам з рабочымі ідзем...

Мужыцкім пачуцьцём казаў, а словы простыя, але цяжкія, крэменем стукалі.

— Праўду ты, Захар, кажаш,—забубнелі мужыкі.—Сколькі гэта мы цярпелі ад вайны, ды ад ерманца гэтага?

— Што і казаць...

Вядома, карыцца ня будзем больш. Няхай прыдзе права наша...

Усё пераблыталася ў гаворцы.

— А ты хто такі будзеш, Захар? Адкуль слоў набраўся такіх?

У Захара—усьмешка на жорсткім твары:

— Я—бальшавік! Мы хочам—зямлю сялянам, заводы і фабрыкі—рабочым...

— Пра-вільна-а!—загрымелі дзесяткі галасоў.—Усю зямлю—сялянам!..

І ў людзей быў неспакой і бунт.

* * *

Восень... І над вёскай Аўсянай цэлыя дні сталў шызы, празрысты туман, падымаўся з соннай рэчкі, з чорнага ўскапычанага, але няворанага ральля, як сеткай агортваў худыя, апантаныя і спужаныя стрэхі хат.

Сонна шумеў гай, згубіўшы сваю моладасьць, жаўцізну бярозавых і кляновых лістоў утапталі людзі ў зямлю, пуста на палёх і залева. Не ўзабаве перад гэтым зьвязьлі дробнае няўраджайнае сёлета збожжа.

Кожны дзень цягнуліся праз вёску фурманкі з небагатым салдацкім скарбам, па гразі везьлі зморэныя коні, нястройна ішлі людзі—ашарпаныя, худыя, ішлі няведама куды з вінтоўкамі на плячох. Зморэныя людзі былі злымі, і лаянка іх была—салёная, сакавітая. Тут-жа мянялі падводы, сяляне запрагалі сваіх коняй, цягнулі далей...

Усе разумелі: была недзе далёка адсюль вайна. Чатыры гады цягнулася праклятая, выматала ў людзей дух, разбурыла жыцьцё, праліла сьлёзы і кроў, а каб сабраць іх, напоўнілі-б яны вазёры і рэкі. За то і злосьць у людзей была вялікая: падымаліся пажары, крышылі і ламалі, што ні пападалася пад руку.

Шапацелі ў руках мужыкоў «керанкі», а купіць за іх нечага было—ні плуга, ні машыны, ні жалеза. Нейкая вялікая і невядомая сіла ўзмахам чорнай аграмаднай рукі застанавіла молат, і плугі і машыны перасталі кавацца. Нейкі вялікі рухавік у жыцьцёвай машыне застанавіўся.

І падняўся ў людзей бунт. Людзі хацелі другога. Тысячамі чорных рук разбурвалі старое.

* * *

А прышло гэта новае і дзіўнае ў Кастрычніку—вялікім месяцы—нечакана для вёскі Аўсянай.

Захар Ягораў на мітынгу загаварыў новымі словамі:

— Саветы... Новая рэволюцыя.. Ленін...

Дзень быў, хоць і васеньні, ясным. Многа народу ішло па вуліцы. Усе бяз шапак. Уперадзе за ўсіх Захар з маладымі хлапцамі і з чырвоным сьцягам.

І вось Захар здаровым гулкім голасам засьпяваў:

— Ад ве-еку мы спалі і нас разбудзі-ілі...

А маладыя хлапцы падхапілі мотыў:

Мы зна-аем, што трэба ра-абіць...

Песьня далей пракацілася, гучней адалася ў задніх радах, неяк папросту ўзбудзіла ўсіх, ахапіла людзей, і тады напэрабой загаварылі:

... Што трэба свабоды-ы...

— Зямлі чалавеку,—загаварылі мужыкі.

І яшчэ буйней, яшчэ вышэй падхапілі:

Што трэба зла-адзеяў за-абі-іць...

Ішлі людзі без тарапліваcьці, цьвёрда ступалі па зямлі, як добра ведаючы мэту, да якой яны павінны прысьці...

Старэнькая бабуля, седзячы на прызьбе, загаласіла, бо вельмі-ж урачыстай была песьня, а дзед, ідучы праз вуліцу з ношкай саломы, скінуў шапку і перахрысьціўся.

У канцы вёскі зрабілі мітынг.

І доўга гудзелі новыя братнія словы, дружныя:

— Сва-абода, таварышы-грамадзяне!

— Усю зямлю сялянам!

— Ленін!..

Гэта было ў вялікім з дванаццаці месяцаў—Кастрычніку, і сонца грэла тады павеснавому...

* * *

Разраслася буйная сіла—маладая, закрасавала ў вобліку прыгожага, магутнага слова:

— Комсамол!

І сіле той ня будзе ні канца, ні меры ў нашы новыя бурныя дні—у гарадох і на загонах, ускапычаных і палітых крывёю і потам.

Здалёк чуецца малады вокрык:

— Мы будуем новае!

А рунь маладая і зялёная ўсё цьвіце, а радасьць і сэнс і шырыню жыцьця не абхопіць абыймаў чалавек!

САЮЗНЫЯ НАВІНЫ.

Будзем ведаць пастановы пленумаў. Бюро Менакругкому ЛКСМБ ухваліла правесьці ў месячны тэрмін па арганізацыі прапрацоўку пастаноў пленумаў ЦК і АК ЛКСМБ.

Прапрацоўка будзе праводзіцца шляхам пастаноўкі дакладаў на пленумах РК і сходах ячэек.

Як прайшоў суботнік. Бюро Менакругкому ЛКСМБ заслухала справаздачу тав. Казанава аб правядзеньні суботніка па Менскай організацыі.

У вынесенай рэзолюцыі бюро АК адзначае прыкладнае правядзеньне суботніку ва многіх ячэйках, што выявілася ў стварэньні грамадзкай думкі вакол гэтага мерапрыемства, прыцягненьні да ўдзелу ў ім беспартыйнай моладзі дарослых рабочых, значнай сумы заробку на карысьць бяспрытульных.

Бяспрытульныя едуць у сваю колёнію.

Цэнтральная камісія дапамогі дзецям разьмеркавала **112 месц усебеларускай дзіцячай колёніі ў Магілеве** па акругах БССР.

Менскай акрузе дадзена 25 месц, Віцебскай—18, Аршанскай—15, Магілеўскай, Гомельскай і Бабруйскай—па 10. Астатнія месцы застаюцца часова ў рэзэрве дзеткамісіі.

Укамплектоўваецца колёнія выключна бяспрытульнымі дзецьмі 10-14 гадоў.

Палепшана дапамога беспрацоўным.

Прэзыдыум ЦСПСБ пастанавіў павысіць нормы дапамогі беспрацоўным—членам саюзаў.

Акрамя таго, кожны беспрацоўны, з непрацаздольнымі членамі сям'і, будзе атрымліваць надбаўку ад 15 да 35 процантаў.

Падарункі школам.

У дні Кастрычніка Наркамасьветы **разаслаў вясковым школам бібліотэкі дзіцячай літаратуры.**

Усяго разаслана 702 бібліотэкі на суму каля 600 рублёў.

У тры радкі.

○ **Закончылася пабудова цэнтральнага вімовага дому адпачынку ў Ждановічах.**

○ У Музэй Рэволюцыі БССР паступілі новыя матар'ялы, якія характарызуюць **дзейнасьць тав. Фрунзэ на Беларусі ў 1917 годзе.**

○ Згодна каштарысу ВСНГ **пабудова новай швэйнай фабрыкі ў Менску будзе каштаваць 223 тысячы рублёў.**

○ З скончыўшых сёлета Мэдфак БДУ маладых дактароў, Наркамат Аховы Здароўя **накіраваў на працу 140 чалавек.**

○ Менгарсавет **асыгнаваў 10 тысяч руб. на пабудову інтэрнату для беспрацоўных.**

○ **Гурткамі самаадукацыі па БССР ахоплена 23.000 чалавек.**

○ Наркамасьветы адчыняе **яшчэ 156 лікпунктаў для дзяцей,** якія перарасьлі школьны ўзрост.

○ Комвуз імя Леніна прыступіў да выданьня **хрэстоматыі па гісторыі Беларусі.**

○ Нарчам Аховы Здароўя вызначыў **стварыць спэцыяльны фонд па організацыі гарачых сьнеданьняў у школах.**

ПАСЬЛЯ ПРОФСАЮЗНАГА ЗЬЕЗДУ.

У пастановах зьезду аддаецца шмат увагі рабочай моладзі.—Зьезд выказаўся за паляпшэньне працы па вытворчым выхаваньні і мэдабслугоўваньні рабочай моладзі, а таксама за большае ўцягненьне яе ў профпрацу.

Зачыніўся ўсебеларускі зьезд профсаюзаў. За час сваёй працы ён абмеркаваў і вырашыў шэраг важных пытаньняў па ўсіх галінах беларускага профруху.

Асабліва актыўна была абгаворана **справаздача Наркампрацы.** Дакладчык тав. **Бэнэк** падрабязна спыніўся на становішчы ў БССР аховы працы, беспрацоўя і зарплаты — «трох кітах», вакол якіх, галоўным чынам, і разгортваліся спрэчкі.

У якасьці неадкладных мерапрыемстваў на далейшы час дакладчык высоўвае:

Павялічэньне асыгнаваньняў на ахову працы;

Барацьбу з несваячасовай выплатай зарплаты аж да прыцягненьня да судовай адказнасьці зарываючыхся гаспадарнікаў;

Барацьбу з беспрацоўем, галоўным чынам, шляхам утварэньня курсаў перакваліфікацыі і новых працколектываў.

У спрэчках шмат гаварылі аб **становішчы моладзі і растучым сярод яе беспрацоўі.**

У бліжэйшы час трэба ўзяцца за **пашырэньне вучнёўскіх брыгад, курсаў ЦІП'у і школ ФЗВ. Неабходна даць кваліфікацыю беспрацоўным падросткам.**

Наступныя дакладчыкі—т. т. **Алесін** (Галоўсоцстрах) і **Барсукоў** (Наркам Аховы Здароўя).

Пасьля гарачых спрэчак зьезд прымае рэзолюцыю, якая вызначае далейшыя задачы Наркампрацы і Галоўсоцстраху ў галіне абслугоўваньня саюзных мас. У гэтай рэзолюцыі, паміж іншым, гаворыцца:

... „—**Даручыць Галоўсоцстраху сумесна з НКАЗ паклапаціцца аб павялічэньні ў бягучым годзе дыспансэраў для дзяцей і падросткаў і нагул палепшыць мэдабслугоўваньне працоўнай моладзі; распрацаваць пытаньне аб організацыі ў 1928 годзе ўсебеларускай колёніі рабочай моладзі».**

Дакладчык аб масавай працы профсаюзаў тав. Каплан гаварыў аб росьце культурных запатрабаваньняў саюзных мас, дзейнасьці нашых клюбаў і іншых культасьветных устаноў, якія заклікаваны абслугоўваць гэтыя масы.

Прынятая зьездам рэзолюцыя, паміж іншым, кажа: **«Прыцягваць рабочую моладзь на агульна-саюзныя сходы, шляхам пастаноўкі на гэтых сходах цікавячых моладзь пытаньняў».**

* * *

Першы пленум ЦСПСБ новага складу абраў прэзыдыум, у склад якога ўвайшлі наступныя таварышы: **Перапечка** (старшыня), **Ісаеў** (сакратар), **Бэнэк, Карп, Гурэвіч, Іваноў, Конанаў, Шаліма** і г. д.

Народным камісарам працы БССР пераабраны тав. **Бэнэк.**

З.

Падпісваемся на пазыку індустрыялізацыі.

Пастанова—ня пусты гук.

Комсамолец Гуліс падпісаўся на 918 проц. сваёй зарплаты.

Служачая моладзь Менакрфінаддзелу падпісалася на пазыку індустрыялізацыі адной з першых. Падпісалася на 140 проц. у адносілах да ўсёй сумы сваёй зарплаты.

Пастанова ячэйкі комсамолу не засталася пустым гукам.

Самы актыўны ўдзел у падпісцы прынялі комсамольцы **Гуліс** (918 проц), зарплаты), **Кантаровіч** (143 проц.) і **Сушкевіч** (103 проц.)

Юнкор.

Прыклад старым.

— Хлопцы! „Цукернікі" абганяюць... Неабходна ўдзельнічаць у конкурсе!—так перагаварваліся комсамольцы заводу „Восход" па пытаньні аб удзеле ў кампаніі падпіскі на пазыку індустрыялізацыі.

Пастанова камсамольскай ячэйкі ажыцьцяўляецца. Хлопцы падпісваюцца на 100 проц. зарплаты і болей.

Актыў падае прыклад старым рабочым.

Левінскі.

Хто колькі можа.

Вучні першай Дубровенскай **сямігодкі** таксама парашылі падпісацца на пазыку. Тры старэйшыя групы сабралі 25 рублёў і набылі абліґацыю. Даваў, хто колькі можа.

Мы, зразумела, сабралі няшмога. Ну а хто зьбярэ больш?

Ігнась Трутко.

Гуліс, Сушкевіч і Кантаровіч.

Хто як уяўляў сабе Кастрычнікавую дэманстрацыю.



Аўтомобілісты
Сябра ТСА-Авіяхіму

Прыхільнік дзяцей
Радысты

ГІСТОРЫЯ САМАЗАБОЙСТВАЎ.

Нагуце „Комінтэрн" было ўжо некалькі спроб самазабойства Глеба для іх паўтарэньня яшчэ ня зьнішчана.

Дадатак да матар'ялу «Чаму атруцілася Казлоўская».

Янінка Вайцэховіч.

За тыдзень за таго, калі атруцілася Казлоўская, уксусную эсэнцыю прыняла была Янінка Вайцэхоўская.

Дзякуючы стараньням дохтара т. Голынскага, прыняўшага тэрміновыя і належныя меры, яна была адратавана.

Янінка працуе ўпакоўшчыцай на заводзе. Яна—маладая работніца.

Што заставіла не **прыняць уксус?**

— У тым-жа адзяленьні працуе некалькі старых работніц. Работа у іх зьдельная, плоцяць за ўпакоўку мяшка 8 к.

Аднаго разу мяшкі, якія ўпакоўвала Янінка, былі пераблытаны з мяшкамі старых работніц.

Падлічыць колькасьць ня было магчымасьці. Тады адна з іх у прысутнасьці ўсіх рабочых аддзяленьня назвала Янінку Вайцэховіч **простытуткай і іншымі ганебнымі словамі.**

У гэты дзень у ведамасьці кооперэтыва па накладной №... было запісана: дэбет—20 к. і ў дужках—уксус.

Янінка прыняла яго!

Ці разьбіраў гэта заўком? Што **зрабіла** адміністрацыя?

— Нічога.

Па мінуламу працуе Янінка, па мінуламу здзекуецца на маладых дзяўчат старая работніца.

Янінка Брыкальская.

Таксама звалі Янінкай. Але толькі гэта Янінка няведала прымяненьня уксусу.

Яна выбрала просты спосаб.

Вышла ў хлеў і закінула вяроўку за бэлку...

Хрып і стоны ня вытрымаўшай Янінкі ўчулі людзі.

Яна была зьнята з вяроўкі з пасінеўшым тварам з зацягнутай шыяй.

Яе таксама выратавалі.

Яна была цяжарная ад аднаго хлопца, а матка яго не дазваляла яму на ёй жаніцца...

Вяроўка перакапала матку і шлюб у касьцеле быў ею благаслаўлён.

Было яшчэ адно самазабойства ў мінулым годзе **на глебе сямейных раздораў.**

Ці ёсьць прычыны, для другіх самазабойстваў?

Ці можа справай Казлоўскай гэтаму паложаны канец?—**Бязумоўна, не!**

Вось факты.

У мужчынскім інтэрнаце тыдзень таму назад пабілі цяжарную работніцу Барабанаву. Яна млоснай ляжала з поўгадзіны.

А жыцьцё пад ваннай, **хасьне гэта ня глеба для такіх учынкаў?..**

Крывое люстра.

Старобінскія ўсходы.

Прачыталі сяляне вёскі Дубей (Старобінскага раёну) артыкул аб пасеве канюшыны і парашылі, што гэта справа добрая. За насеньнем, як гэта раіла газэта, зьвярнуліся ў коопэрацыю—у сваё Старобінскае сельска-гаспадарчае таварыства.

— Ого! наша насеньне вельмі добрае, лепшага нідзе не дастанеце,—казалі ім коопэратары.

Сяляне «аўторытэтным» словам коопэратараў паверылі і, закінуўшы торбачкі, напоўненыя насеньнем, за плечы, накіраваліся дахаты.

Яно так і павінна быць: коопэрацыя павінна мець самае лепшае насеньне, словы коопэратараў павінны быць аўторытэтнымі, сяляне павінны ім верыць і купляць толькі ў коопэрацыі.

Але пачакайце...

Укінуўшы зярняткі канюшыны ў зямлю, сяляне чакалі **чаго?** (гаворачы языком настаўніка вясковай школы)—**Добрага ўраджаю,—адкажам мы.**

Вось вам і ураджай—**узышло ўсяго 15—20 проц.**

Калі-ж пасьля гэтага сяляне зьвярнуліся ў коопэрацыю за тлумачэньнямі, загадчык крамы **Бранц** адказаў ім **«А што-ж вы хацелі, каб у нас прападалі соткі?—Няхай ляпей у вас прападзе па 5 фунтаў.**

Атрымаўшы такі адказ ад гр-на **Бранца,** сяляне зьвярнуліся да агранома, каб ён паехаў для вызначэньня процанту ўсхожасьці і склаў акт.

Агроном іх просьбу таксама адхіліў.

Таварышы «коопэратары» і «аграномы», а пра такую птушку—РСІ—вы чулі?

Сумар.

Ня горш, як у другіх.

(Ліст у рэдакцыю).

У 104 нумары „Чырвонай Зьмены" быў надрукованы допіс пад загалоўкам: „Што кажуць прызыўнікі", дзе паміж іншым гаварылася, што ячэйка ЦСУ ніякай падрыхтоўчай працы да прызыву не праводзіць.

З гэтай прычыны лічым патрэбным зазначыць, што наша ячэйка ваеннай працы аддала ня мала ўвагі.

Улетку быў організаваны стралковы гурток пры ячэйцы, які першы час добра працаваў, але потым з-за нядбайных адносін саміх комсамольцаў гурток распаўся.

Зараз організаваўся зноў стралковы гурток, але ўжо не пры ячэйцы, а пры ўстанове. Гэтым гуртком будзе ахоплена значная частка комсамольцаў.

Сіламі ячэйкі і піонэр-атраду добра абсталяваны стралковы куток, дзе ёсьць дзьве вінтоўкі, тры процівагазы розных сыстэм, некалькі вучэбных гранат, вайсковыя карты, малюнкі і іншыя вайсковыя прылады.

Комсамольская ячэйка трымае цесную сувязь з падшэфнай вайсковай часткай. На сходах ячэйкі сталі даклады аб ваенізацыі комсамолу і аб прызыве 1905 году і задачах комсамолу ў арміі.

Напярэдадні сьвяткаваньня МЮД'у мы наладжвалі вечар у падшэфнай часьці. Тамжа наладзілі спаборніцтвы па стральбе. На гэтым вечары была амаль уся ячэйка.

Акрамя гэтага на пасяджэньнях бюро нашай ячэйкі прысутнічаюць заўсёды прадстаўнікі вайсковай часткі. Абменьваліся насьценнымі газэтамі. Зараз сумесна вядзецца падрыхтоўка да вечара провадаў, як дэмобілізаваных чырвонаармейцаў, так і мобілізаваных комсамольцаў.

Аліп.

На „Беларускі Піонэр"

падпісваемся колектыўна на 4 месяцы:

Трыбулёў Р. П. (Ворша), Ланін І. М. (Ворша), Ракуба К. М. (Мазыр), Жалязьняк Е. В. (Мазыр), Адзінец М. С. (Менск), Новікаў В. Г. (Гомель), Бенін (Гомель), Сьвістанюк (Гомель), Найман Х. Н. (Бабруйск), Малаковіч М. (Бабруйск), Осіпаў Я.С. (Полацк), Рывін (Менск), Пякарчык А. (Менск), Махнач М. (Менск), Пурысон (Ворша), Касы Н. А. (Магілеў), Пятроў (Магілеў), Ільлін П. (Менск), Пачобут А. (Менск), Якімовіч А. (Менск), Мазур (Менск), Башкевіч (Менск), Рывес (Менск), Ратнэр (Менск), Якаўлеў (Віцебск), Бараньнікаў А. (Менск).

Выклікаем падпісацца на стольні-ж усіх сакратароў і агітпропаў АК, старшынь райбюро ЮП, акруговых інспэктароў народнае асьветы, загадчыкаў піонэрскіх клюбаў і сямёхгодак.

Навука і жыцьцё.

На службе вытворчасьці.

Апошнія 10 год навукова-тэхнічная думка Савецкага Саюзу ўпарта працавала ў двух напрамках: над **мэханізацыяй асобных галін прамысловасьці і над палягчэньнем працы рабочага.**

Машына на дрыгве.

Сур'ёзныя навуковыя адносіны да здабычы торфу былі праяўлены ўпяршыню толькі пасьля Кастрычніка. Тарфяныя залежы ў СССР складаюць 78 проц. сусьветных запасаў торфу. Акрамя таго, гэтыя запасы штогод павялічваюцца.

Таму ўжо ў 1921 годзе т. **Ленін** ставіць на IX Зьезьдзе Саветаў пытаньне аб гідраўлічным спосабе здабычы торфу. Гэты спосаб быў вынайдзены інжынэрам **Класонам,** які нядаўна памёр. Моцная вадзяная плынь размывае тарфяны масыў. Потым асобныя машыны—торфасосы—высмоктваюць тарфяную кашу.

Зараз гэты спосаб ужываецца на шмат якіх савецкіх электрастанцыях. Рабочым тут ужо ня прыходзіцца стаяць па пояс у дрыгве і падпадаць пад небясьпеку захварэньня.

Хутка пасьля Кастрычніка гадавая здабыча торфу пачынае перавышаць даваенны ўзровень. Бязупынны рост здабываемай колькасьці торфу дасягае ў 1926 г. **196 мільёнаў пудоў,** а гэта значыць **амаль у два разы больш чым у 1914 г.** (107 млн. пуд.).

Пры электрыфікацыі цэнтральна-прамысловага і Паўночна-Заходняга раёнаў СССР торф адыграе выключную ролю.

Нафта, вызваленая ад „гаспадароў".

Да Кастрычнікавай рэволюцыі, калі нафтавыя промыслы належалі шматлікім «гаспадаром», ня было магчымасьці палепшыць здабычу нафты.

Толькі пасьля Кастрычніка ўведзена, напрыклад, закрытая эксплёатацыя нафты. Гэта важнае ўдасканаленьне мае на мэце не даваць выпарыцца лёгкім часткам нафты.

«Азнафта» да сучаснага моманту дабывае, такім чынам, **каля паловы ўсёй сваей нафты.**

Савецкай-жа ўладзе абавязана сваім нараджэньнем і маладая галіна нафтавай справы—**атрыманьне газаліну з натуральнага газу.**

«Грознафтай», на промыслах якой газ вельмі багаты прысутнічаньнем газаліну, пабудованы зараз спэцыяльныя заводы.

У адносінах **электрыфікацыі буравых шчылін,** савецкія спэцыялістыя абагналі нават амэрыканцаў. Расход нафтапаліва на промыслах, у сувязі з гэтым, значна скараціўся. Вельмі важным дасягненьнем зьяўляецца ўведзены пасьля рэволюцыі спосаб здабычы нафты глыбокімі насосамі. Раней, у часы прыватных «гаспадароў», гэтага ня было. Нафта вычэрпвалася са шчылін асобнай пасудзінай—жалонкай. Было цяжка і нязручна. А зараз на промыслах адной «Азнафты» ўстаноўлена 1180 штук глыбокіх насосаў. У сувязі з скарачэньнем выдаткаў, павышана зарплата рабочых.

Яшчэ шмат дасягненьняў мае наша нафтавая прамысловасьць. Так, напрыклад, пабудаваны нафтаправод Грозны—Туапсэ. У Грозным пабудованы новы парафінавы завод і г. д.

Новыя шахты.

Мэханізацыя здабычы каменнага вугалю далёка шагнула наперад за гэтыя 10 год.

Так, напрыклад, «Донвугаль» за апошні час устанавіў на сваіх капальнях каля 300 **урубавых машын.** Дзякуючы гэтым машынам, дасягаецца магчымасьць экономіць на кожнай здабытай тоне вугалю 76 кап.

Другое—ня менш важнае новаўвядзеньне ў каменна-вугальнай прамысловасьці—«скрэпер». Раней перавозка вугалю ў шахтах утваралася саначкамі. Саначнікі звычайна падбіраліся з моладзі. Па вузкім калідорчыку трэба было цягнуць, з усіх сіл, «карыта» вугалю вагой, прыкладна, у 20 пудоў. Гэта была сапраўды адская праца. Ужываньне «скрэпера» дае зараз магчымасьць мэханізаваць дастаўка вугалю ўнутры шахты.

Шырока пастаўлена ў СССР навуковая праца па тэхніцы бясьпечнасьці. У шахтах устаноўлены для асьвятленьня акумулятарныя лямпы.

Пры падтрымцы т. **Леніна** заснаваны ў 1921 г. асобна цёпла-тэхнічны інстытут. Ён займаецца вывучэньнем магчымасьцяў спальваньня розных відаў паліва нізкага гатунку.

У Донбасе зараз падрыхтоўваецца пабудова вельмі глыбокіх (500—700 мэтраў) новых шахт, якія будуць абсталяваны па апошнім слове заходня-эўропэйскай тэхнікі.

Самалёты з савецкага матар'ялу.

На зьмену жалезу ў наш век зьяўляюцца вырабы з колерных мэталяў.

На Урале зараз будуецца шэраг новых заводаў па апрацоўцы такіх мэталяў.

У 1928 г. будзе пушчан **Корсакпайскі медзяплавільны завод.** Закончаны па удовай вопытны **сьвінцовы завод.** Будуюцца **цынкавы завод** і інш.

За рэволюцыйнае 10-годзьдзе намі зроблены вялікія посьпехі па распрацоўцы **вольфрамавых руд.** Вольфрам, калі яго ўводзяць у склад сталі, робіць апошнюю цьвёрдай, яна тады лепш захоўвае сваю закалку пры высокай тэмпэратуры. З такой сталі вырабляюцца розныя тэхнічныя інструмэнты. Вольфрамавая нітка сьвеціць нам і ў электрычнай лямпачцы. У СССР організавана зараз вытворчасьць такой ніткі.

І, урэшце, на нашых савецкіх заводах вырабляецца лёгкі сплаў алюмінія высокай моцнасьці, які ідзе на пабудову нашых самалётаў.

Гэты сплаў (кальчуг-алюміні) вынайдзены савецкімі тэхнікамі і па якасьці ня ўступае замежнаму сплаву.

* * *

Немагчыма ў кароткім нарысе асьвятліць усе тыя велічэзныя дасягненьні, якія мае савецкая навука і тэхніка да гадавіны Кастрычніка.

Дзесяткі інстытутаў, лябораторый, навуковых таварыстваў, сотні новых вынаходцаў працуюць над грандыёзнай задачай тэхнічнай рэволюцыі. З кожным годам мы маем усё новыя і новыя перамогі на гэтым фронце.

Абвестка.

АПА Менакругкому КП(б)Б даводзіць да ведама ўсіх слухачоў вячэрняй савпартшколы, што заняткі аднаўляюцца ў панядзелак, 14 лістапада, а 7-й гадзіне ўвечары ў новым памяшканьні (Савецкая, 44, чыгуначная школа). Групы Гарадзкога і Ляхаўскага раёну займаюцца на трэцім паверсе, Акцябрскага—на другім.

ЗГУБЛЕНЫ:

— Комсамольскі білет за № 72405, на імя **Баньноўскага Д.,** выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 8919, на імя **Штыцько К.,** выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

— Комсамольскі білет за № 42454, на імя **Жызьнеўскага А.,** выдадзены Менакругкомам ЛКСМБ.

Адказныя рэдактары: А. БАРАНЬНІКАЎ. А. КУРЦІК.

Галоўлітбел № 24867. Менск, 1 друкарня БДВ.